

ICON
МАРТ
2017 №2 (49)
ICON-MAGAZINE.BY
DO
IT
YOUR
SELF
ДЕНИС ПИЧУГ
ЭКСКЛЮЗИВНО В I






WWW.ZROBYM.BY







# ZROBYM ARCHITECTS

## ОФІС СТУДЫІ

Архітэктары: Аляксей Караблёў, Андрусь Bezdar
Размяшчэнне: вул. Мележа 5/2, Мінск, Беларусь
Плошча: 120 кв. м.
Год рэалізацыі: 2016
Фатограф: Канончанка Аляксандра

Памяшканне, дзе мы збіраліся зрабіць свой офіс раней належыла салону Fusion House і ўжо мела дызайн, створаны архітэктарамі Аннай і Станіславам Макеевымі. Нашай задачай было цалкам перарабіць прастору пад патрэбы офіса сваёй студыі. Ад старога дызайну мы пакінулі падзел памяшкання шклянымі перагародкамі на 4 часткі. У нашай студыі зараз чатыры функцыянальныя зоны: хол, зона кіраўнікоў і перамоваў, open-space з архітэктарамі і co-working для нашых партнёраў. Ствараючы офісны дызайн, мы арыентаваліся на сусветныя тэндэнцыі і ў той жа час скарысталі некаторыя беларускія прыёмы. Нам хацелася ў гэтай прасторы адлюстраваць канцэпцыю таго стылю, у якім мы працуем. У аздабленні выкарыстаны нашы любімыя матэрыялы: архітэктурны бетон, рэйкі з тэрмадрэва, жывыя сцены з раслін, сцяна і столь з моху, дэкаратыўны іржавы метал, крафтавы кардон і інш. Асвятленне пададзена рознымі тыпамі з рознай каляровай цеплынёй. Мэбля ў офісе зроблена нашым уласным брэндам BY FURNITURE – яна адрозніваецца лаканічнасцю, простымі формамі й выразным дызайнам. Таксама, сярод прадметаў інтэр'еру сустракаецца мэбля з другаснаперапрацаваных матэрыялаў: напрыклад крэсла і лямпы з кардонных трубак. Дызайн нашай студыі створаны намі для саміх сабе. Тут мы самі былі і замоўцамі, і архітэктарамі. У нейкім родзе гэта своеасаблівы эксперымент, бо шмат якія дызайнерскія прыёмы мы апрабавалі тут упершыню. Мы лічым правільным падыходам эксперыментаваць на сабе перш, чым прапаноўваць ідэю сваім кліентам.